УДК 378.14:81

# КАМП'ЮТАРНАЕ ТЭСЦІРАВАННЕ НАВУЧЭНЦАЎ УНІВЕРСІТЭТА Ў ПРАКТЫЦЫ ВЫКЛАДАННЯ БЕЛАРУСКАЙ МОВЫ

А. В. ШАРАПАВА
Беларуска-Расійскі ўніверсітэт
Магілёў, Беларусь

На сучасным этапе развіцця грамадства асаблівую актуальнасць набывае педагагічная дзейнасць, скіраваная на фарміраванне высокапрафесійнай маладой асобы. Пра гэта гаварыў і Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь А.Р. Лукашэнка ў сваім штогадовым Пасланні беларускаму народу і Нацыянальнаму сходу ад 19 красавіка 2019 года: «Сёння сусветнае развіццё вызначаецца прарыўнымі тэхналогіямі, новымі галінамі, якія ствараюць эканоміку ведаў. Нам патрэбны прафесіяналы, што валодаюць падобнымі кампетэнцыямі». Разам з тым, кіраўнік дзяржавы звярнуў увагу на важнасць валодання абедзвюма дзяржаўнымі мовамі: «Калі хтосьці хоча згубіць розум, ён згубіць рускую мову! Калі ён хоча згубіць сваё сэрца, ён згубіць беларускую мову. Што вы хочаце згубіць – розум або сэрца?» [1]. Асаблівую актуальнасць ва ўстановах вышэйшай адукацыі тэхніка-тэхналагічнага профілю набывае выкарыстанне інфармацыйна-камунікацыйных тэхналогій пры вывучэнні дысцыпліны «Беларуская мова (прафесійная лексіка)», што спрыяе вырашэнню пастаўленых перад адукацыйнай сістэмай задач.

У адпаведнасці з Канцэпцыяй інфарматызацыі адукацыі Рэспублікі Беларусь на перыяд да 2020 года, зацверджанай у 2013 годзе [2], любы навучэнец павінен мець доступ да электронных адукацыйных рэсурсаў і паслуг як ва ўстановах адукацыі, так і дома. Падобнае магчыма рэалізаваць у фармаце віртуальнай адукацыйнай прасторы з дапамогай найбольш распаўсюджанага ў беларускіх установах вышэйшай адукацыі праграмнага прадукта LMS Moodle (Modular Object-Oriented Dynamic Learning Environment). Анлайн-рэсурс на платформе Moodle уяўляе сабой комплекс метадычных рэкамендацый і практычных заданняў, ён актыўна выкарыстоўваецца ў нашай практыцы выкладання вучэбнай дысцыпліны. Ён складаецца з 17 тэм, да кожнай прапануюцца заданні навучальнага і кантралюючага характару. Доступ да інфармацыі магчымы праз камп'ютар, планшэт, смартфон, што падключаны да сеткі інтэрнэт. Матэрыялы размешчаны ў сістэме дыстанцыйнага навучання на афіцыйным сайце Беларуска-Расійскага ўніверсітэта (http://www.bru.by/). Студэнту надаецца ўласны логін і пароль, з дапамогай якіх ён можа ўвайсці ў сістэму як з уласнага смартфона дома ці ў вучэбнай аўдыторыі, так і непасрэдна ў Цэнтры дыстанцыйнага навучання, камп'ютарных класах ці бібліятэчных залах універсітэта.

Электронная библиотека Белорусско-Российского университета
http://e.biblio.bru.by/

Для сістэмы адукацыі актуальным становіцца лозунг «Сучасны навучэнец – мабільны навучэнец!» [2]. Адным з эфектыўных інструментаў мабільнасці з’яўляецца камп’ютарнае тэсціраванне, якое дае магчымасць не толькі праверыць і ацаніць веды, але і вызначыць праблемы ў засваенні і практычнай рэалізацыі пэўнага матэрыялу [3]. Падобнае можна рэалізаваць на занятках, у часе прамежкавага кантролю, бягучай атэстацыі. Навучэнцам прапануюцца тэсты, якія складаюцца з пытання і чатырох магчымых варыянтаў адказу на іх, толькі адзін з адказаў правільны. Кожнаму з раздзелаў тэмы адпавядае розная колькасць пытанняў – ад 1 да 5. Зразумела, што большаць з іх адносіцца да практыкаарыентаваных тэм – марфалогіі і сінтаксісу. Максімум пытанняў у тэсце – 30. Сістэма Moodle дае магчымасць выбраць дату доступу да тэста, колькасць часу, неабходнага на яго правядзенне (у нашай практыцы на вырашэнне 1 пытання даецца 1 мінута), метад ацэньвання. За работу ацэнку выстаўляе праграма, што, па-першае, пазбаўляе ад усялякага суб’ектывізму, па-другое, дае магчымасць падлічыць колькасць правільных адказаў у балах або працэнтах. Важна, што навучэнец мае магчымасць праверыць сябе, бо пасля завяршэння тэста указваюцца правільныя і няправільныя адказы.

Такім чынам, камп’ютарнае тэсціраванне ў межах платформы Moodle з’яўляецца адным з элементаў інфарматызацыі і віртуалізацыі навучальнага працэсу, што з’уляецца адным з прыярытэтных напрамкаў мадэрнізацыі вышэйшай прафесійнай адукацыі ва ўмовах інавацыйнага развіцця Рэспублікі Беларусь.

## СПІС ВЫКАРЫСТАНАЙ ЛІТАРАТУРЫ

1. Концепция информатизации системы образования Республики Беларусь на период до 2020 года [Электронный ресурс]. – Режим доступа: https://edu.gov.by/statistics/informatizatsiya-obrazovaniya/. – Дата доступа: 10.02.2020.

2. Послание Президента Республики Беларусь А. Г. Лукашенко белорусскому народу и Национальному собранию Республики Беларусь 19 апреля 2019 г. [Электронный ресурс]. – Режим доступа: http://president.gov.by/ru/news_ru/view/poslanie-belorusskomu-narodu-i-natsionalnomu-sobraniju-20903/. – Дата доступа: 02.02.2020.

3. **Шарапава, А. В.** Асаблівасці выкарыстання тэставых заданняў у працэсе вывучэння дысцыпліны «Беларуская мова. Прафесійная лексіка» / А. В. Шарапава, Г. В. Сагіева // Образование, наука и производство в XXI веке : современные тенденции развития : материалы юбилейной Междунар. конф. – Могилев : Белорус.-Рос. ун-т, 2016. – С. 52–53.

Электронная библиотека Белорусско-Российского университета
http://e.biblio.bru.by/